Эти ценности расположились в конце, набрав сторонников от 13 до 19 %.

Анализ полученных в ходе социологических опросов данных позволил выявить фундаментальные изменения в ценностной структуре молодежи. Сравнив полученные данные с исследованием "Динамика ценностей реформируемой России 1990—1993 гг.", проводившимся под руководством Н.И.Лапина, мы вслед за российскими исследователями фиксируем: прежняя идеологизированно-монолитная структура начала трансформироваться в плюральную, дифференцированную на более десяти элементных ценностных позиций и четыре макропозиции. В ценностном сознании белорусов возникли конфликтные узлы, мотивирующие поведение различных категорий граждан, в том числе и военнослужащих.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А.В. Макараў,**
*прафесар*

## ПАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАЙ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ

Важным кампанентам агульнай культуры выпускніка вышэйшай навучальнай установы з'яўляецца палітычная культура. Роля і значнасць гэтай грамадзянскай характарыстыкі будучага спецыяліста ўзрастае ў сучасных грамадствах, што трансфармуюцца, да якіх адносіцца і беларускі соцыум. Пошук новых каштоўнасных арыенціраў характэрны сёння для ўсіх транзітыўных краін, што ажыццяўляюць пераход да дэмакратычнага грамадзянскага грамадства. У гэтай сувязі заканамерныя пытанні: якімі павінны быць каштоўнасныя каардынаты, у рамках якіх фарміруюцца сацыяльна-палітычныя якасці асобы студэнта? Ці магчыма вылучыць пэўныя вектары навучальна-выхаваўчай дзейнасці ВНУ ў гэтым накірунку?

Уяўляецца, што міжнародны вопыт і практыка пераходнага перыяду ў Беларусі дазваляюць станоўча адказаць на гэтыя пытанні і вылучыць некаторыя метадалагічныя і дыдактычныя прынцыпы фарміравання палітычнай культуры студэнтаў у працэсе выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

Па-першае, у перыяд выкладання сучасных сацыяльна-гуманітарных ведаў асаблівае значэнне мае рэалізацыя антрапацэнтрысцкага падыходу да навучання і выхавання.

У прымяненні да вывучэння сацыяльна-палітычнай тэорыі гэта прадугледжвае "чалавечае вымярэнне" сацыяльна-палітычнай сферы жыццядзейнасці людзей. Гаворачы словамі французскага палітолага Мішэля Фуко, гістарычнае развіццё ўяўляе сабою не што іншае, як пантэон "цялесных практык", "дысцыплінарных практык", маргінальных практык" і да т. п. Інакш кажучы, чалавек(і) ствараў(юць) "чалавечыя практыкі" ў выглядзе канкрэтных інстытутаў улады, канкрэтных палітычных працэсаў. А не наадварот.

Што тычыцца тэхналогіі адлюстравання антрапалагічнага падыходу ў палітычнай мадэлі, то, на наш погляд, гэта можа ажыццяўляцца дваяка: 1) як аналіз рэтраспектывы палітычных адносін, ствараемых чалавекам на ўзроўнях рацыянальнага і ірацыянальнага, а таксама як аналіз сучаснай палітычнай жыццядзейнасці не толькі з пазіцый вывучэння нарматыўных палітычных канструкцый, але і (у меншай ступені) з улікам адэкватнасці палітыкі існасці, першароднасці і эвалюцыі самога чалавека. Гэты зрэз антрапалагічнага можа прысутнічаць практычна ва ўсіх тэмах курса; 2) як канцэнтрат канкрэтна-антрапалагічнага ў асобных раздзелах, тэмах навучальнага курса "Паліталогія". Да прыкладу, такім мог бы быць раздзел (тэма) "Чалавек у палітыцы" або "Чалавечае вымярэнне палітыкі".

Па-другое, дамінуючым у сацыяльна-гуманітарнай адукацыі выступае культуралагічны падыход. Ён прадугледжвае некалькі вымярэнняў: сукупнасць каштоўнасцей, формы дзейнасці чалавека (тэхналогіі), якія гістарычна склаліся, міжасобасныя сувязі людзей (камунікацыі). Апошняя састаўляючая выступае ў якасці этычнай дамінанты, арыентаванай на такія каштоўнасці чалавечага жыцця, як дабро, самаразвіццё асобы, прызнанне множнасці культурных самабытнасцей чалавека, дасягненне адзінства ў сукупнасці з плюралізмам.

У праекцыі на курс паліталогіі культуралагічны падыход азначае аналіз, вызначэнне і ілюстрацыю палітычных адносін праз прызму вышэйназваных вымярэнняў. Гісторыя палітычных адносін — гэта адзін са зрэзаў, пластоў адзінай і шматграннай гісторыі культуры, чалавечай цывілізацыі. Эвалюцыя палітычных адносін непарыўна звязана з генезісам культуры ў цэлым. Таму нарматыўнасць у паліталогіі таксама не можа не арыентавацца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на аксіялагічныя вымярэнні культуры. Асобныя тэмы паліталогіі могуць стаць абагульняючымі ў плане культуралагічнага вымярэння палітыкі.

Па-трэцяе, фарміраванне і развіццё палітычнай культуры студэнцкай моладзі нельга аддзяліць ад фактару нацыянальна-культурнай самабытнасці беларускага грамадства. У дакументах ЮНЕСКА, прысвечаных аналізу рэформ і развіццю адукацыі ў свеце, у апошняе дзесяцігоддзе ў якасці аднаго з галоўных вывадаў адзначаецца, што "... прамое запазычванне замежных канцэпцый і каштоўнасцей, ігнараванне рэгіянальных і нацыянальных культур і філасофій цягнуць за сабой негатыўныя наступствы для адукацыі..." (1).

У прымяненні да беларускіх рэалій гэта азначае ўлік нацыянальна-культурнай самабытнасці, менталітэту народа, спецыфікі этапу, які перажывае наша грамадства, і характару сацыяльна-палітычнага развіцця. У гэтай сувязі экстрапаляцыя замежных (універсальных) паліталагічных падыходаў павінна ўвязвацца і карэкціравацца з тым, што можна абазначыць як нацыянальную кампаненту і фактар канкрэтна-гістарычнай арыентацыі і развіцця краіны.

Па-чацвёртае, у свеце набірае хуткасць тэндэнцыя постмадэрнісцкага развіцця цывілізацыі. Адпаведна пачынаецца чарговая пакутлівая пераацэнка каштоўнасцей. У сферы сацыяльна-палітычных ведаў і практыкі ў парадак дня ставяцца праблемы сучасных (постмадэрнісцкіх) палітычных сістэм, палітычных суб'ектаў у постмадэрнісцкую эпоху, адэкватнага формаўтварэння палітычнай культуры (2).

Па-пятае, фарміраванне палітычнай культуры студэнцтва ўжо з-за вышэйпералічаных прычын павінна насіць пэўны рэгулятыўны характар у рамках трыяды: выклік цывілізацыі — сацыяльны заказ грамадства і дзяржавы — інтарэсы асобы.

У вядомай ступені кіруемасць гэтага працэсу мае нарматыўную базу ў беларускіх стандартах вышэйшай адукацыі па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Узровень патрабаванняў, што прад'яўляюцца да выпускнікоў у адпаведнасці з адукацыйным стандартам, змяшчае і кампаненты палітычнай культуры (3). У той жа час прадстаўляецца найлепшым падыход некаторых даследчыкаў да больш пашыранай трактоўкі нарматыўных патрабаванняў у стандарце да агульнай культуры выпускнікоў (4). Пры распрацоўцы другога пакалення беларускіх стандартаў такі падыход было б мэтазгодна прыняць пад увагу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Трэба адзначыць шматфактарны, варыяцыйны характар працэсу фарміравання палітычнай культуры студэнцтва ў кантэксце сацыяльна-гуманітарных ведаў, што абнаўляюцца.

1. *Рэформа* і развіццё вышэйшай адукацыі: Праграмны дакумент ЮНЕСКА — Б. м., 1995. — С. 27.

2. *Панарын А.С.* Паліталогія: Дапаможнік. — М., 1995.

3. *Адукацыйны* стандарт. Вышэйшаая адукацыя. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. — Мн. 1999.

4. *Зімняя І.А. і інш.* Агульная культура чалавека ў сістэме патрабаванняў Дзяржаўнага адукацыйнага стандарта. — М., 1999.

**А.П.Юрмальнік,**
*аспірантка*

## ТРАДЫЦЫІ НАРОДНАЙ ПЕСЕННАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АНСАМБЛЯ "ПЕСНЯРЫ"

На парозе трэцяга тысячагоддзя мы ўсё часцей задумваемся аб далейшым лёсе нацыянальнай культуры, спрабуем зразумець, што стане галоўным у яе развіцці ў наступным стагоддзі, ці магчыма будзе захаваць і перадаць нашчадкам духоўнае багацце, набытае народам за ўсю яго гісторыю. Асабліва важным становіцца праблема захавання традыцый культуры і трансфармацыі іх у актуальныя для новага часу формы. У канцы XX ст., у час распаўсюджання масавай песеннай культуры, якая выкарыстоўвае спрошчаныя меладычныя і гарманічныя схемы і тэксты невысокага мастацкага ўзроўню, далейшае функцыянаванне культуры народа выклікае заклапочанасць. Важна, каб народная песенная традыцыя аказвала ўплыў на развіццё масавай песні. У гэтай сувязі каштоўным уяўляецца вопыт творчага пераасэнсавання беларускай песні ансамблем "Песняры".

Ансамбль "Песняры", які адлюстроўвае ў сваёй творчасці ўсю паўнату жыццёвых праблем беларускага народа, стаў своеасаблівым сімвалам музычнай культуры Беларусі. "Песняры" з'явіліся на савецкай эстраднай сцэне ў 70-я гг. з ідэямі адраджэння і папулярызацыі беларускай народнай песні. Ансамбль падняў беларускую народную песню на высокі мастацкі ўзровень, захапіў ёю свет і прыцягнуў да яе ўвагу сотняў тысяч беларусаў, якія жывуць у розных краінах свету.